# XXVI З'ЕЗДУ КПСС — ДАСТОЙНУЮ СУСТРЭЧУ!

**ПАД ТАКІМ ДЭВІЗАМ ПРАЦАВАЛІ БАЙЦЫ СТУДЭНЦКІХ БУДАЎНІЧЫХ АТРАДАЎ УНІВЕРСІТЭТА ГЭТЫМ ЛЕТАМ. АБ ІХ ПРАЦОЎНЫХ ЗДАБЫТКАХ І ПОСПЕХАХ У ГРАМАДСКА - ПАЛІТЫЧНАЙ РАБОЦЕ ЧЫТАЙЦЕ НА 2—3-й СТАРОНКАХ.**

**А ГЭТЫ ЗДЫМАК ЗРОБЛЕНЫ Ў ЧАС ВЯРТАННЯ СБА З ПСКОЎСКАЙ ВОБЛАСЦІ. РАДАСНЫЯ, ШЧАСЛІВЫЯ, ІДУЦЬ СТУДЭНТЫ МЕХМАТА: ЭКЗАМЕН ТРЭЦЯГА СЕМЕСТРА ВЫТРЫМАНЫ!**

*ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!*

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

1980 г.
4
ВЕРАСНЯ
ЧАЦВЕР
№ 24 (1288)
Выходзіць раз у тыдзень.
Цана 2 кап.


● ТАБЕ, АМАТАР КНІГІ

## Летапіс БДУ

ВЫЙШАЎ З ДРУКУ буклет «Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна». Гэта невялікае па аб'ёму выданне (усяго адзін аркуш), але вельмі змястоўнае, з задавальненнем разгорнуць чытачы. Студэнты і выкладчыкі таксама знойдуць для сябе шмат цікавага. І, напэўна, былыя выхаванцы універсітэта будуць па-добраму зайздросціць сённяшняму студэнту, якому пашанцавала займацца ва ўтульных аўдыторыях, карыстацца такой багатай бібліятэкай, прыладамі, слухаць выдатных вучоных. Буклет нагадае ім пра маладосць, дапаможа ўспомніць і сваіх выкладчыкаў, сяброў.

Нешта яны параўнаюць, супаставяць. І ў кожнага з іх будзе адно здзіўленне: як хутка расце, прыгажэе, набірае сілы універсітэт.

Не проста было рэдактару-складальніку А. І. Кажушкову паказаць шматграннасць універсітэта, раскрыць яго сённяшні дзень. Аднак сваёй мэты гэта выданне дасягнула — буклет стане сапраўдным летапісам жыцця БДУ імя У. І. Леніна.

**М. ЛАХВІЧ,**
**наш кар.**

АКТУАЛЬНАЕ ІНТЭРВ'Ю

## ДАВЕР'Е ПАТРЭБНА АПРАЎДАЦЬ

**ЖНІВЕНЬ — ГАРАЧАЯ ПАРА ДЛЯ ЮНАКОЎ І ДЗЯЎЧАТ. КОЖНЫ ГОД СОТНІ МАЛАДЫХ ЛЮДЗЕЙ ПЕРАСТУПАЮЦЬ У ГЭТЫЯ ДНІ ПАРОГ БДУ. МНОГІЯ З ІХ УЖО ДАЎНО ВЫБРАЛІ СВАЮ БУДУЧУЮ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ, НЕКАТОРЫЯ Ж ПРЫХОДЗЯЦЬ ВА УНІВЕРСІТЭТ, ЯШЧЭ НЕ ВЫРАШЫЎШЫ КАНЧАТКОВА, НА ЯКІ ФАКУЛЬТЭТ ПАЙСЦІ.**

**З МЭТАЙ АБЛЯГЧЭННЯ ПАСТУПАЮЧЫМ ВЫБАРУ ШЛЯХУ, ДАПАМОГІ ІМ САРЫЕНТАВАЦЦА Ў ВНУ І ПРАЦАВАЛА ПРЫЁМНАЯ КАМІСІЯ.**

**ЦЯПЕР, КАЛІ ЎЖО СКОНЧЫЛІСЯ ЎСТУПНЫЯ ЭКЗАМЕНЫ, СПІСЫ БЫЛЫХ АБІТУРЫЕНТАЎ —СЁННЯШНІХ СТУДЭНТАЎ ВЫВЕШАНЫ, МОЖНА ПАДВЕСЦІ НЕКАТОРЫЯ ВЫНІКІ РАБОТЫ ПРЫЁМНАЙ КАМІСІІ. НА ПЫТАННІ НАШАГА КАРЭСПАНДЭНТА І. САВЕТКІНАЙ АДКАЗВАЕ М. І. БАЗЫЛЕЎ — АДКАЗНЫ САКРАТАР ПРЫЁМНАЙ КАМІСІІ.**

**КАРЭСПАНДЭНТ: Раскажыце, калі ласка, як праходзіла падрыхтоўчая і бягучая работа прыёмнай камісіі, што было новага ў параўнанні з мінулым годам?**

**М. І. БАЗЫЛЕЎ:** Работа прыёмнай камісіі пачынаецца задоўга да ўступных экзаменаў. Студэнты, выкладчыкі БДУ — частыя госці розных гарадоў і вёсак рэспублікі. Яны выязджалі з лекцыямі аб універсітэце, яго факультэтах. У гэтым годзе было створана 52 брыгады, адбыліся агітвыезды і агітпрабегі. Матэрыялы прыёмнай камісіі рассылаліся па прадпрыемствах і арганізацыях, складаліся спісы спецыялізаваных школ, агульны спіс усіх школ рэспублікі.

Акрамя агітацыйна-масавых мерапрыемстваў, у гэтым годзе найбольшая ўвага ў рабоце прыёмнай камісіі ўдзялялася паглыбленай прафарыентацыі, каб юнакі і дзяўчаты яшчэ да паступлення мелі максімум ведаў аб будучай прафесіі. У адрозненне ад мінулага года мы імкнуліся разгарнуць работу па прафарыентацыі не як разавае мерапрыемства, а як сістэму, вылучаючы найважнейшыя звенні стацыянарных форм работы — прафарыентацыю праз падрыхтоўчае аддзяленне і курсы, школы «юных», алімпіяды школьнікаў, навуковыя таварыствы, гурткі і факультатывы ў школах; праводзілі дні адкрытых дзвярэй.

**КАРЭСПАНДЭНТ: Дарэчы, ці існуе своеасаблівая «гарантыя» для тых, хто займаўся ў школах «юных», удзельнічаў у алімпіядах?**

**М. І. БАЗЫЛЕЎ:** Не, такой перавагі няма. Але калі абітурыенты маюць аднолькавую колькасць балаў, мы, натуральна, вырашаем пытанне на карысць тых, хто мае граматы за перамогі ў алімпіядах, накіраванні школы «юных» і г. д.

**КАРЭСПАНДЭНТ: Які сярэдні бал атэстата ў абітурыентаў, ці многа медалістаў?**

**М. І. БАЗЫЛЕЎ:** Асноўны састаў паступаючых у нашу ВНУ — медалісты і тыя, у каго атэстат 5 або 4,5 бала. Вельмі мала такіх, у каго бал атэстата 4. Такім чынам, план прыёму выконваецца за лік медалістаў і моладзі, якая мае пяцібальны атэстат. Хлопцы і дзяўчаты, якія пастаянна пражываюць у сельскай мясцовасці, паступаючы ва універсітэт на педагагічныя спецыяльнасці, атрымліваюць звыш набраных 2 балы, бо ўдзельная вага абітурыентаў з сельскай мясцовасці меншая, чым з горада, і, акрамя таго, памяншаецца ў працэсе адбору.

**КАРЭСПАНДЭНТ: У параўнанні з мінулым годам які конкурс на дзённае аддзяленне?**

**М. І. БАЗЫЛЕЎ:** У гэтым годзе конкурс ніжэй, прыкладна 500 чалавек у агульнай колькасці паступаючых недабрана. Гэта абумоўлена шэрагам прычын. Па-першае, у сувязі з пераносам тэрміну ўступных экзаменаў работа прыёмных падрыхтоўчых курсаў не змагла разгарнуцца ў поўную сілу, і звычайная колькасць слухачоў — 800—900 чалавек— знізілася ў гэтым годзе да 350.

Акрамя таго — дэмаграфічны спад, і з гэтага года ў іншых ВНУ краіны былі ўведзены вострадэфіцытныя спецыяльнасці, на якія быў прыток моладзі, паступаючай па эксперыменту. У многіх тэхнікумах паступленне праходзіць без экзаменаў.

**КАРЭСПАНДЭНТ: Што вы можаце сказаць аб узроўні падрыхтоўкі абітурыентаў-вячэрнікаў? Які ў іх быў прахадны бал, конкурс?**

**М. І. БАЗЫЛЕЎ:** У вячэрнікаў і завочнікаў у гэтым годзе конкурс быў значна вышэй і якасней, чым у мінулыя гады. Вельмі вялікі конкурс быў на юрфак, гістфак. На механіка-матэматычны факультэт, напрыклад, паступала 28 медалістаў. І наогул абітурыенты гэтых аддзяленняў выглядалі нядрэнна падрыхтаванымі.

**КАРЭСПАНДЭНТ: І апошняе. Вашы пажаданні сённяшняму папаўненню.**

**М. І. БАЗЫЛЕЎ:** Канешне, добрай вучобы! Бо хто заслужыў высокага гонару быць студэнтам БДУ, павінен яго апраўдаць.

# НЕ КАЖДОМУ ДАНО ТАК ЩЕДРО ЖИТЬ,

## ТРЭЦІ ПРАЦОЎНЫ ФІНІШЫРАВАЎ

ПРАЦОЎНАЕ ЛЕТА-80. Яно было неверагодна цяжкім па свайму напружанню, насычаным значнымі падзеямі ў жыцці краіны. У працоўным семестры 1980 года прыняло ўдзел звыш 3 тысяч студэнтаў Белдзяржуніверсітэта. Гэта самы высокі паказчык за ўсе гады ўдзелу БДУ ў студэнцкім будаўнічым руху. Геаграфія ўдзелу СБА універсітэта ў выкананні народнагаспадарчых планаў завяршаючага года дзесятай пяцігодкі, як заўсёды, шырокая. На аб'ектах Пскоўскай вобласці працавалі 14 атрадаў, у Карэльскай АССР — таксама 14, у Малдаўскай ССР — 18 атрадаў, 27 студэнцкіх атрадаў працавалі на тэрыторыі рэспублікі, з іх у Мінскай вобласці — 20, у Віцебскай — 5, у Гродзенскай і Гомельскай — па аднаму. Два атрады працавалі на будаўніцтве БАМа (СБА імя Ленінскага камсамола Беларусі і СБА «Спадчына»). Зводны інтэрнацыянальны будаўнічы атрад «Сябры» працаваў на збудаванні лесапрамысловага комплексу ў горадзе Усць-Ілімск. Акрамя таго, у горадзе Мінску працавалі 9 будаўнічых атрадаў. Атрады «Сервіс» і «Алгарытм» абслугоўвалі гасцей «Алімпіяды-80». Байцы студэнцкага атрада «Мерыдыян» працавалі ў якасці праваднікоў на чыгуначным маршруце Мінск—Жданаў.

Вынікі працоўнага семестра падводзіць пакуль рана, але ўжо сёння можна сказаць, што выдатна папрацавалі такія атрады, як «Спадчына» механіка-матэматычнага факультэта, «Венсэрэмас» фізічнага, «Белая Русь» юрыдычнага і многія іншыя.

**А. ШЫБУТ,**
**начальнік штаба працоўных спраў БДУ імя У. І. Леніна.**

**ТОЛЬКІ ФАКТ**

## Узнагарода лепшым

ЗАВЯРШЫЎСЯ працоўны семестр 1980 года. І хоць вынікі яго яшчэ не падведзены, ужо сёння можна сказаць, што студэнцкія будаўнічыя атрады універсітэта папрацавалі добра.

Лепшыя прадстаўнікі СБА БДУ імя У. І. Леніна ўзнагароджаны турыстычнымі путзёўкамі для паездкі ў Сацыялістычную Рэспубліку Румынію. Сярод іх — Віктар Грамыка, студэнт V курса фізічнага факультэта, камандзір СБА «Венсэрэмас», які стаў пераможцам сацыялістычнага спаборніцтва сярод Новаржэўскай зоны Пскоўскай вобласці. Разам з ім паедуць Міхаіл Чарапок, студэнт IV курса факультэта радыёфізікі і электронікі, камандзір СБА імя А. Матросава, які працаваў сёлета у Карэльскай АССР, Ала Нежавец, выпускніца механіка-матэматычнага факультэта, бяззменны камісар студэнцкага атрада «Расінка», Ларыса Валчок, загадчыца сектара ўліку камітэта камсамола універсітэта, удзельніца чатырох працоўных семестраў.

Не менш захапляючым абяцае быць і круіз па маршруту Грэцыя — Алжыр — Канарскія астравы — Марока — Гвінея, які запланаваны на люты 1981 года. У ім таксама прымуць удзел прадстаўнікі універсітэта.

**А. СЦЯПАНАЎ.**

**ФОТАРЭПАРТАЖ**

## ЭКЗАМЕН ЛЕТА

ВЁСКА КАРПАВА на Пскоўшчыне. У гэтым годзе тут працавалі тыя, хто вырашыў прысвяціць сваё жыццё служэнню пяру. Гэта — байцы студэнцкага атрада імя Уладзіміра Амельянюка, студэнты Беларускага дзяржаўнага універсітэта, будучыя журналісты. Праўда, працавалі яны не з «лейкай» і блакнотам, а кельмамі і рыдлёўкамі. Рабяты будавалі ачышчальныя збудаванні і бетанавалі падлогу ў птушніку.

Каб забетанаваць адзін пралёт, патрэбна каля 130 насілак з растворам. А важаць кожныя з іх не менш сарака кілаграмаў. К канцу дня рукі быццам адвальваліся. Але звеннявы Андрэй Мазанік вельмі тонка адчуваў настрой байцоў. Калі цяжка — падтрымае жартам, калі нешта не атрымліваецца — дапаможа зрабіць правільна. На будоўлі ён не навічок. Працоўная школа не прайшла дарэмна — звеннявы валодае некалькімі будаўнічымі спецыяльнасцямі. Ён і бетоншчык, і зваршчык, і муляр. Магчыма таму кожны з байцоў атрада лічыў за гонар працаваць у звяне Андрэя. Самы цяжкі ўчастак, а ўсе ішлі іменна сюды. І зайздросцілі Уладзіміру Дашуку, які працаваў тут з першага дня.

Для большасці рабят СБА — першае ў жыцці сур'ёзнае выпрабаванне. Іменна тут яны правяраюць сябе на трывалась характару. У многіх ужо ёсць практыка ў газетах. Але

## СЛАЎНАЕ ІМЯ «АЭЛІТЫ»

**КАЛЕКТЫЎНЫ РАСКАЗ СТУДЭНТАЎ РАДЫЁФІЗІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА АБ СВАІМ АТРАДЗЕ «АЭЛІТА»**

**В. ЛАБУДА:**

Не згодзен з тымі, хто лічыць, што адпачыць пасля сесій, набрацца сіл магчыма толькі на марскім пляжы, у санаторыі, на турбазе. Байцы атрада «Аэліта», як і многія тысячы савецкіх студэнтаў, летнія канікулы правялі па-іншаму. Зладжана, з маладым запалам працавалі мы на розных аб'ектах. Гэта буйны склад, будынак радыёстанцыі, пірс для пажарнага вадаёма, сярэдняя школа.

**В. ПІСКУН:**

Фарміраванне нашага атрада пачалося ў лютым. Касцяк застаўся ранейшым, ды і новыя байцы пакідалі прыемнае ўражанне. Станавілася ясна, што калектыў атрымаўся баявым, які павінен быць у ліку першых. «Аэліта» павінна быць у эліце! Нам любая справа па плячы!» — да многага абавязвае наш дэвіз. Арганізацыйны перыяд праляцеў хутка, прайшла і першая прыцірка характараў. Наступіў час адпраўляцца ў дарогу. Прызнацца, сумна было ехаць з Мінска. Мне здаецца, што ва ўсіх нас у глыбіні душы жыло адчуванне шчасця. Напэўна, гэта было шчасце цудоўнага аб'яднання. Ці радасць быць патрэбнымі людзям. Не дарэмна ж на пероне пад перабор гітар чуліся словы вядомай песні: «Не каждому дано так щедро жить, на память людям города дарить!».

**П. РУСАК:**

Сем гадзін раніцы... Камунебудзь яшчэ сніцца салодкі сон, а дзяжурны па лагеру ўжо гатовы падняць байцоў «Аэліты». Паснедаўшы, усе становяцца на лінейку. Атрымаўшы заданне на працу, бяром неабходны інструмент і адпраўляемся на аб'екты. Пасля работы — рэпетыцыя агітбрыгады, прагляд тэлевізійных перадач. У 23 гадзіны — адбой. Так вось і праходзілі дні будатрадаўцаў.

**В. ЗІНКЕВІЧ:**

Было ў нас нямала вясёлых і прыемных хвілін. Бо добра працаваць у горадзе, дзе цёпла сустракаюць, дзе жывуць добрыя і ветлівыя людзі.

**В. ДАЙЛЮДЗЕНКА:**

З першых дзён пасля прыезду пачалі актыўную грамадскую работу. Рэгулярна выходзіла цікавая і змястоўная насценгазета. Вялікім поспехам карысталіся выступленні атрадных артыстаў.

**В. ПІСКУН:**

Вось такія нашы летнія будні. Былі некаторыя недарэчнасці, як звычайна бывае ў пачатку, але паступова ўсё прыйшло ў парадак.

Лета-80 яшчэ больш узняло аўтарытэт «Аэліты».

**А. СВЕЦІН.**

## Да новых сустрэч!

У ТРЭЦІ РАЗ на юрыдычным факультэце быў сфарміраваны студэнцкі будатрад «Ветразь». Касцяк атрада склалі вопытныя будатрадаўцы. Бязменным застаўся камандзір атрада, студэнт III курса Аляксандр Бараноўскі, майстар атрада Ігар Дудараў.

За плячыма атрада былі два працоўныя семестры. Гэта Беларусь і Пскоўшчына. А сёлета мы працавалі ў Карэліі.

Атрад у цэлым быў сфарміраваны ўжо к канцу сакавіка. На гэты раз у яго ўваходзіла 30 чалавек. У тым ліку Ганаровы баец, двойчы Герой Савецкага Саюза Сяргей Іванавіч Грыцавец.

... І вось колы вагона выстукваюць кіламетры рэек. Дзесьці далёка засталіся Беларусь, дом. А за вокнамі праплываюць маляўнічыя краявіды Карэліі. Нарэшце мільгануў агеньчык цягніка і мы засталіся на платформе. Аднак нас ужо чакалі, чакалі нашы кварцір'еры, прадстаўнікі арганізацыі. Адчувалася, што да студэнтаў тут адносяцца сур'ёзна. І ў гэтым мы ўпэўніліся пазней. Добрая падрыхтоўка арганізацыі дазволіла нам ужо праз дзень пачаць работу.

Атрад працаваў на рэканструкцыі сушыльнага цэха цагельнага завода. Трэба было гэту работу зрабіць як мага хутчэй і лепш. І вось тут сваё слова сказалі камуністы. Яны задавалі тон ў рабоце. Атрад выканаў заданне на 5 дзён раней намечанага з адзнакай «добра».

Акрамя гэтага асноўнага аб'екта, байцы працавалі яшчэ на некалькіх. Дагаворныя абавязацельствы мы выканалі раней намечанага. А ўсяго асвоена 90 тысяч рублёў капіталаўкладанняў. Шматграннай была і грамадска-палітычная дзейнасць атрада. Прачытана 13 лекцый, дадзена 3 канцэрты.

Цікава і напружана ішло жыццё атрада. Гэта і сустрэчы з ветэранамі вайны і працы, і дапамога школе, і будаўніцтва дзіцячай пляцоўкі. Непрыкметна праляцеў час — пара развітвацца. Цягнік вязе нас дадому. Да пабачэння, Карэлія. Да новых сустрэч!

**М. КЛОКАЎ,**
**камісар СБА «Ветразь».**

РАСКАЖУ АБ ТАВАРЫШУ

# ГАНАРЫМСЯ ТАБОЙ

**У ТОЙ ДЗЕНЬ на адкрытай танцпляцоўцы пасёлка, дзе знаходзіўся СБА «Верасы-80», адбыўся ўрачысты сход, прысвечаны Дню будаўніка і Дню фізкультурніка. Рабяты з атрада прынялі актыўны ўдзел ў правядзенні гэтага мерапрыемства. Сход праходзіў арганізавана, і рабяты былі задаволены. Але асабліва прыемна было байцам атрада пачуць аб узнагароджанні ганаровым вымпелам «Лепшы па прафесіі» і памятным медалём повара атрада «Верасы-80» Людмілы Фянько. Выконваючы свае абавязкі па кухні, дзяўчына ўвесь час клапацілася аб стварэнні ў кожнага байца добрага працоўнага настрою, прымала актыўны ўдзел у грамадскім жыцці атрада.**

**Галоўная рыса яе характару — гатоўнасць у любую хвіліну прыйсці на дапамогу іншаму чалавеку. Таму калі аднойчы аб'явілі, што для пералівання крыві хворай жанчыне неабходны донары, Люда адна з першых прапанавала ўзяць у яе кроў. Дапамога аказалася своечасовай. Жанчына была выратавана. Калі ж потым рабяты прапанавалі Людзе дзень адпачыць, яна адмовілася.**

**Мы ганарымся яе высакароднасцю і душэўнай шчодрасцю. Няхай час ніколі не прымусіць цябе змяніць жыццёвую пазіцыю, Люда!**

**М. ЖУК,**
**баец СБА «Верасы-80».**

# ВЫТРЫМАНЫ ПАСПЯХОВА

адна справа — пісаць аб людзях працы, зусім іншае — сваімі рукамі адчуваць, якая цяжкая праца.

Прымаючая будаўнічая арганізацыя вынікамі работы атрада задаволена. Студэнты выканалі запланаваны аб'ём работ, дапамаглі мясцовым калгасам і саўгасам: правялі некалькі суботнікаў па нарыхтоўцы кармоў.

Атрад носіць імя Героя Савецкага Саюза Уладзіміра Амельянюка, які быў крыху сталей рабят у будатрадаўскай форме, калі ў 1942 годзе перашлы нумар падпольнай мінскай газеты «Звязда» адкрываўся перадавым артыкулам, напісаным яго рукой. Уладзімір Амельянюк загінуў, пакінуўшы незабыўны след у сэрцах людзей. І рабяты, у сваю чаргу, пакідаюць добрую памяць аб сабе на зямлі Пскоўшчыны.

Да гэтага часу захоўвае ў сабе пскоўская зямля асколкі мінулай вайны. У адной толькі вёсцы Карпава жывуць дзесяць ветэранаў Вялікай Айчыннай. Што могуць зрабіць будучыя журналісты? У многіх ветэранаў захаваліся франтавыя пісьмы, пажаўцелыя ад часу. І байцы вырашылі нанізаць іх фотакопіі, каб захаваць для нашчадкаў жывы летапіс гісторыі.

Галоўнае — за семестр рабяты па-сапраўднаму навучыліся сябраваць. Прайшло лета, і раз'ехаліся яны, а ўспаміны аб атрадзе, дзе ўсё агульнае — і радасць, і сум, засталіся на ўсё жыццё.

**В. МАСКАЛЁЎ.**
Фота аўтара.

**На здымках:** СБА імя У. Амельянюка прыбыў у Мінск; апошняя атрадная лінейка; дзякуй, камандзір!

ШТО ЗА ПАЧЫНАМ

# Слова стрымалі

**«СТУДЭНЦКІ БУДАЎНІЧЫ АТРАД ІМЯ АКАДЭМІКА С. І. ВАВІЛАВА БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА, ВЫСТУПІЎ З ІНІЦЫЯТЫВАЙ — НАРЫХТАВАЦЬ 40 ТОН КАРМОЎ ДЛЯ ГРАМАДСКАЙ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ».**

НЕ ЗАЎСЁДЫ пачуеш такія шчырыя словы ў адрас студэнтаў будатрадаў ад кіраўнікоў гаспадарчых арганізацый, якія сказаў дырэктар саўгаса «Туча» Канстанцін Іванавіч Захарчук. Аб байцах СБА імя Вавілава Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна ён з павагай і ўдзячнасцю зазначыў:

— Такіх хлопцаў на руках насіць трэба.

... Амаль два месяцы працаваў гэты атрад у вёсцы Дунайчыцы Клецкага раёна. Прыехаў і адразу наладзіў дзелавыя адносіны з кіраўніцтвам саўгаса. Даведаўшыся, што тут не хапае людзей на нарыхтоўцы кармоў, студэнты рашылі дапамагчы гаспадарцы ў гэтай нялёгкай справе. Атрад абавязаўся за трэці працоўны семестр, акрамя асноўнай працы на будаўнічым аб'екце, нарыхтаваць 40 тон кармоў, адрамантаваць сіласную яму.

Так у абласным студэнцкім будатрадзе нарадзілася каштоўная ініцыятыва: «Нарыхтоўцы кармоў — клопаты СБА».

Я пабываў у атрадзе імя Вавілава ў адзін з выхадных дзён. Студэнтаў-будаўнікоў застаў на саўгасным полі.

... Камісар атрада Андрэй Кузьмін, па-майстэрску валодаючы сахаром, укладвае сена ў кузаў машыны. Ён як галоўны натхніцель і арганізатар пачыну робіць сур'ёзную заяўку на яго безумоўнае выкананне. Побач не менш старанна гэтую ж аперацыю выконвае камандзір Уладзімір Курыла. Гэта ён, узважыўшы сілы і магчымасці атрада, спыніўся на сарака тонах. Зараз прызадумаўся: а ці не мала?

— Андрэй, трымай, — знізу крычыць Сяргей Кацяшоў і падае ў кузаў цэлую капну сена. Старанна працуюць Мікалай Салановіч і Юра Вайтукевіч. Праходзіць час і...

— У нас гатова, — крычыць Валодзя Курыла з нагружанай да верху машыны, —не менш дзвюх тон будзе...

Хутка машына Андрэя таксама была гатова да адпраўкі. Першая навіна ўзрадавала ўсіх: ёсць 6 тон сена.

Я спытаў, ці сапраўды будзе поўнасцю выкананы пачын. Тады ў байцоў была цвёрдая ўпэўненасць у гэтым. СБА імя Вавілава нарыхтаваў 119 тон кармоў, з іх 62 тоны сена. Як бачна, пачын выкананы. І выкананы, скажам шчыра, з гонарам, як належыць студэнтам.

**А. АЛЯКСЕЕЎ.**

ІНТЭРАТРАД

# НА МОВЕ ДРУЖБЫ

ВА ЎСЕСАЮЗНЫ рух СБА вялікі ўклад уносіць і гістарычны факультэт БДУ імя У. І. Леніна. Штогод тут фарміруецца не менш 7 атрадаў. Па рашэнню камітэта камсамола на факультэце быў створаны інтэрнацыянальны атрад імя Гарыбальдзі. У ім працавала 11 замежных студэнтаў (з В'етнама, Грэцыі і Лаоса). Жаданне лепш пазнаць і зразумець адзін аднаго дапамагло рабятам зблізіцца і пасябраваць. Яны разам працавалі, удзельнічалі ў выступленні агітбрыгады, праводзілі лектарскую работу. Асабліва цікавым для замежных студэнтаў быў удзел у аперацыі «Памяць». Сустракаючыся з ветэранамі вайны, яны больш даведаліся аб нашай краіне, лепш зразумелі наш народ.

Дружба і ўзаемаразуменне — так можна назваць адносіны, якія склаліся ў атрадзе. Хочацца верыць, што практыка стварэння такіх атрадаў ва універсітэце будзе паспяхова працягвацца.

**І. РОМАН,**
**камісар СБА імя Гарыбальдзі.**

РАДКІ З ПІСЬМА

# *Шчырае дзякуй*

МЫ, ЖЫХАРЫ ВЕРХНЯДЗВІНСКАГА раёна Віцебскай вобласці, ляснік Міхаіл Мікалаевіч Бязводзіцкі і пенсіянерка Марыя Аляксандраўна Бязводзіцкая сардэчна дзякуем студэнту механіка-матэматычнага факультэта, байцу атрада «Зарніцы» Леаніду Петрусевічу.

На другі дзень пасля прыезду атрада «Зарніцы» адбыўся няшчасны выпадак — загарэлася наша сядзіба. Агонь станавіўся ўсё большым і большым. На ўліку была кожная хвіліна.

І вось у гэты момант заўважыў пажар зусім нам незнаёмы хлопец і прыбег на дапамогу. Дзякуючы яго дзеянням, агонь патушылі.

Вельмі просім ад нашага імя выразіць падзяку Леаніду Петрусевічу.

**З павагай Бязводзіцкія.**

БАМ

# Маршрут новы — Сібір

**На пытанні нашага карэспандэнта С. ЛЫСКАЎЦА адказвае студэнт пятага курса мехмата, баец атрада «Спадчына» Аляксей ШАРАПКОЎ.**

— Мне вельмі падабаецца наш атрад. Ён дружны і згуртаваны па-сапраўднаму, бо працуюць у ім выдатныя хлопцы і добрыя майстры сваёй справы. Гэта ў першую чаргу камандзір Ігар Юрэвіч, камісар Васіль Фурман, Міхаіл Сасіновіч, Міхаіл Шэлестаў і шмат іншых. Усіх і не пералічыць. Усяго — 46 чалавек. Прычым толькі двое прыйшлі ў атрад упершыню. З астатнімі я працаваў у розных кутках нашай краіны. Мы былі ў Пскоўскай вобласці, каля пушкінскіх мясцін, дзе выконвалі надзвычай празаічную работу — будавалі жывёлагадоўчыя комплексы, і ў Кіжах на будаўніцтве прычалаў, і ў іншых мясцінах. Сёлета працавалі ў Сібіры, будавалі дарогі.

З заданнем атрад справіўся паспяхова. Замест 300 тысяч рублёў капіталаўкладанняў, якія трэба было асвоіць па плану, атрад асвоіў 382 тысячы рублёў. Цікава, што гэта самы вялікі аб'ём работ, які нам калі-небудзь прыходзілася выконваць. А што датычыцца агітбрыгады, то яна папрацавала, як кажуць, на славу — дадзена 15 канцэртаў.

Спадабаўся мне цудоўны сібірскі край. Але расказваць пра яго нельга, трэба ўсё ўбачыць сваімі вачыма. І яшчэ. Вельмі запомніўся «медыум» — наша атрадаўскае свята, якое адзначаецца ў сярэдзіне кожнага працоўнага семестра. На ім было ўсё: урачыстае шэсце, вечар гумару, танцы, дыскатэка.

# НА ПАМЯТЬ ЛЮДЯМ ГОРОДА ДАРИТЬ!

# ЗА МІР БЕЗ ВАЙНЫ

АДУКАЦЫЯ І РАЗЗБРАЕННЕ

**НЯДАЎНА Ў ПАРЫЖЫ Ў ШТАБ-КВАТЭРЫ ЮНЕСКА АДБЫЎСЯ СУСВЕТНЫ КАНГРЭС «АДУКАЦЫЯ І РАЗЗБРАЕННЕ», У РАБОЦЕ ЯКОГА ЎДЗЕЛЬНІЧАЎ ЗАГАДЧЫК КАФЕДРЫ НАВУКОВАГА КАМУНІЗМУ ІНСТЫТУТА ПАВЫШЭННЯ КВАЛІФІКАЦЫІ ВЫКЛАДЧЫКАЎ ГРАМАДСКІХ НАВУК ПРЫ БЕЛАРУСКІМ ДЗЯРЖАЎНЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА ДОКТАР ФІЛАСОФСКІХ НАВУК, ПРАФЕСАР А. Д. ГУСЕЎ. НІЖЭЙ МЫ ПУБЛІКУЕМ ЯГО ПАВЕДАМЛЕННЕ АБ ВЫНІКАХ РАБОТЫ КАНГРЭСА.**

СУСВЕТНЫ КАНГРЭС, у якім прыняло ўдзел больш як 500 дэлегатаў — педагогаў школ і ВНУ, спецыялістаў у галіне адукацыі і інфармацыі з многіх краін усіх кантынентаў свету, пераканаўча прадэманстраваў імкненне сусветнай навукова - педагагічнай грамадскасці да захавання і замацавання разрадкі, спынення безразважнай гонкі ўзбраенняў, якую распальваюць ЗША і іншыя імперыялістычныя дзяржавы. Ужо тыя абставіны, што кангрэс, прадзенню якога усяляк перашкаджалі краіны імперыялізму, адбыўся і абмеркаваў важную грамадскую праблему — пытанне аб ролі адукацыі ў замацаванні міру і яе садзейнічанне поўнаму і ўсеагульнаму раззбраенню пад эфектыўным міжнародным кантролем, само па сабе з'яўляецца істотным укладам у справы міжнароднай разрадкі.

Дзелавы, канструктыўны падыход кангрэса да праблем быў абумоўлены актыўнай і прынцыповай пазіцыяй прадстаўнікоў сацыялістычных і цэлага шэрагу краін, што развіваюцца. У ходзе агульнай дыскусіі і ў камітэтах па адукацыі і інфармацыі яны выказалі шмат каштоўных ідэй і ўнеслі канкрэтныя прапановы па развіццю інтэрнацыянальнага выхавання моладзі, ролі сістэмы адукацыі ў прадухіленні пагрозы тэрмаядзернай вайны.

Трыбуна кангрэса ЮНЕСКА дала магчымасць абмяняцца вопытам інтэрнацыянальнага выхавання моладзі ў розных краінах свету. З вялікай цікавасцю яго ўдзельнікі пазнаёміліся з вопытам, які назапашаны ў Беларускай ССР. Выкладчыкі і студэнты нашай рэспублікі ўносяць значны ўклад ў расшырэнне навукова - педагагічнай сувязі з выкладчыкамі і студэнтамі іншых краін свету і тым самым садзейнічаюць узаемаразуменню і даверу паміж народамі. З кожным годам узрастае колькасць замежных навучэнцаў у ВНУ і сярэдніх спецыяльных навучальных установах БССР. За апошнія 5 год яна павялічылася амаль у 2,5 раза, а колькасць студэнтаў з краін, якія развіваюцца, — больш чым у 3 разы. У мінулым навучальным годзе ўпершыню прынялі студэнтаў Беларускі інстытут народнай гаспадаркі, Беларускі тэхналагічны інстытут, Мінскі інстытут культуры, Беларускі тэатральна - мастацкі інстытут, Беларуская кансерваторыя.

У Беларускім дзяржаўным універсітэце ў мінулым навучальным годзе займалася 730 замежных студэнтаў і аспірантаў з 62 краін свету.

Прыведзеныя факты далі ўдзельнікам Сусветнага кангрэсу магчымасць пераканацца, што ўся сістэма адукацыі і выхавання ў Беларусі заклікана развіваць у моладзі пачуццё сваёй адказнасці за лёс міру, імкненне ўнесці ўклад у сацыяльны прагрэс і ўмацаванне бяспекі народаў. Гэта сістэма поўнасцю адпавядае патрабаванням Канстытуцыі БССР, у якой запісана, што інтэрнацыянальны абавязак кожнага грамадзяніна Беларускай ССР заключаецца ў тым, каб садзейнічаць развіццю дружбы і супрацоўніцтва паміж народамі іншых краін, падтрымцы і ўмацаванню ўсеагульнага міру.

Вынікам Сусветнага кангрэсу ЮНЕСКА з'яўляецца заклік замацаваць на нацыянальным і міжнародным узроўнях педагагічную і навукова - даследчую дзейнасць, накіраваную на выхаванне ў моладзі актыўнага імкнення пакончыць з гонкай узбраенняў, каб забяспечыць гэтаму і будучым пакаленням людзей трывалую ўпэўненасць у мірным і шчаслівым заўтра.

Ліст дадому... Фотаэцюд С. Лыскаўца.

# Гісторыі-загадкі старшыны Свісткова

**Ад аўтара:**
**— Дзіцячы транспартны траўматызм — самая сумная старонка у статыстыцы дарожных бед. Толькі ў мінулым годзе на вуліцах Мінска адбылося 108 дарожна-транспартных здарэнняў з удзелам дзяцей. У выніку 7 чалавек загінула і 103 атрымалі раненні. Што ж з'явілася прычынай гэтых няшчасцяў? У большасці выпадкаў няўважлівасць, непавага да правілаў руху, а часам і няведанне гэтых правіл. Вось таму спадзяёмся, што нашым дзецям небескарысна будзе прачытаць ці паслухаць гэтыя гісторыі.**

## Ліхтары на вуліцы

Памятаю, Жэня першы раз прыехаў у горад. Быў ён тады зусім маленькім, і шмат што ў горадзе для яго было незразумелым.

— Скажыце, дзядзя Грыша, — пытаўся ён, — чаму гэта ў вас на вуліцы ліхтары гараць? Яшчэ ж дзень...

— Якія ліхтары? — не зразумеў я спачатку.

— Ды нейкія дзіўныя. У іх тры агні: чырвоны, жоўты і зялёны...

— А, вось яно што! — я хацеў растлумачыць, што за ліхтары бачыў Жэня, але ён стракатаў, як кулямёт.

— ...І шчыты нейкія з малюнкамі. Адны — круглыя, другія — трохвугольныя, трэція — квадратныя. Шафёр як убачыць іх, то ці паверне куды-небудзь, ці цішэй паедзе, а то і зусім прыпыніцца.

— А побач з нашым домам ты бачыў такі дыск? — спытаў я.

— Вядома, бачыў. Ён на слупе вісіць. Круглы такі, чырвоны, а пасярэдзіне жоўтая цагліна намалявана. Наш шафёр хацеў спачатку заехаць на двор, але як толькі ўбачыў гэты шчыт, адразу ж прыпыніўся і гаворыць: «Сюды ехаць нельга». А чаму нельга? Ён жа, дыск гэты, высока вісеў і зусім нам не перашкаджаў.

Я, вядома, расказаў Жэню і пра ліхтары, і пра шчыты, якія называюцца... Але — стоп! Гэта ж і для вас, рабяты, пытанне: як называюцца тыя «ліхтары» і «дыскі», якія бачыў Жэня? Што вы ведаеце пра іх? Для чаго яны ўстанаўліваюцца на вуліцы?

## ЗЕБРА

Аднойчы мы з Жэнем былі ў перасоўвачным звярынцы. Каго мы толькі там не бачылі: і слоноў, і вярблюдаў, і тыграў. Але больш за ўсё нам спадабаліся зебры — маленькія такія паласатыя конікі.

— Жэня, — спытаў я, калі мы адышлі ад клеткі, — ты хацеў бы ўбачыць зебру прама на вуліцы?

— Вядома, — гаворыць Жэня, — а па якой вуліцы яна бегае?

— Ты яе, — кажу, — можаш сустрэць на любой вуліцы.

Цэлы дзень мы хадзілі і ездзілі па гораду. Жэня ўвесь час чакаў, калі ж ён убачыць зебру. А пад вечар сказаў мне:

— Ну і жартаўнік вы! «Зебра на вуліцы...»

— А ты што, не бачыў яе?

— А вы бачылі? — пытаннем на пытанне адказаў Жэня.

— Бачыў. І не адзін раз. Вядома, Жэня не паверыў мне. Хаця я гаварыў чыстую праўду. Вы не верыце мне, рабяты?

**Гісторыі-загадкі запісаў старшы інспектар ДАІ г. Мінска**

**Р. АЎРАМЕНКА.**

**АДГАДКІ:**

1. «Ліхтары на вуліцы». Тут размова ідзе аб светафоры і дарожных знаках.

2. «Зебра» — так называецца размечаны палоскамі пешаходны пераход.

# Газета выступіла. Што зроблена?

НА АПУБЛІКАВАНЫ матэрыял **«Трэцяя страла»** ў газеце «Беларускі універсітэт», № 19 ад 22 мая 1980 года паведамляем, што абмеркаванне становішча спраў у народным студэнцкім тэатры Белдзяржуніверсітэта адбылося 9 чэрвеня 1980 года. На абмеркаванні прысутнічалі У. С. Багданаў — прарэктар БДУ, І. А. Рыбчынская — член парткома, В. Д. Анісенка — рэжысёр тэатра, Д. Г. Тыцюк — загадчык пастановачнай часткі, М. М. Дрозд — старшыня прафкома, Л. П. Лазарава — дырэктар клуба.

Пачатак новага навучальнага года ў народным студэнцкім тэатры быў нялёгкім. Адбылася поўная змена кіраўнікоў тэатра. Работа тэатра насіла хаатычны характар па прычыне неўкамплектаванасці штатаў. На працягу трох месяцаў не было ў тэатры галоўнага рэжысёра. БДУ да гэтай пары не мае свайго клубнага памяшкання, таму ўсе калектывы мастацкай самадзейнасці, у тым ліку і народны студэнцкі тэатр, займаюцца ў вучэбных аўдыторыях, якія выдзяляе галоўны дыспетчар (ад эксплуатацыі сцэны актавай залы галоўнага корпуса кіраўніцтва тэатра адмовілася). Зрывы рэпетыцый адбываліся па прычынах адсутнасці свабодных аўдыторый. Для ліквідацыі недахопаў было прапанавана звярнуцца да прарэктара па АГЧ аб рэарганізацыі сцэнічнай пляцоўкі ў старым фізічным корпусе і прыстасаванні яе да патрэб студэнцкага тэатра; адшукаць рэзервы і магчымасці для набыцця тэатру неабходнай тэхнічнай апаратуры і сцэнічнага аснашчэння.

Прапанавана ўсе афарміцельскія і пашывачныя работы выконваць не кустарным спосабам, а ў дзяржаўных спецыялізаваных майстэрнях.

**Л. ЛАЗАРАВА,**
**дырэктар студэнцкага клуба.**

Рэха ўступных экзаменаў. Фота Ф. Бачылы.


**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

4 верасня 1980 г.

АТ 04683 Заказ 1282.



220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.
ТЭЛЕФОН 22-07-19

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ